ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 150 (1117) / ПАНЯДЗЕЛАК, 30-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

XVI ЗЬЕЗД УсеКП(б)

Даклад тав. Кагановіча

28-га чэрвеня на ранішнім паседжаньні зьезду тав. Кагановіч, спатканы шумнымі аплёдысмэнтамі, выступіў з організацыйнай справа задачай ЦК партыі. Даклад тав. Кагановіча заняў усё ранішняе паседжаньне зьезду і працягваўся пяць гадзін.

Пачаўшы з указаньня, што організацыйная работа праведзена ЦК у поўнай адпаведнасьці з установкай Леніна, цалкам падпарадкоўвалася політыцы партыі, тав. Кагановіч абмаляваў асноўныя практычныя задачы—лёзунгі, якія партыя высунула ў пэрыод ад XV да XVI партзьезду. Гэтых задач-лёзунгаў чатыры: забясьпечаньне хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі краіны і, у адпаведнасьці з гэтай задачай, перабудова ўсіх масавых рабочых організацый, соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва як клясы, і, у адпаведнасьці з гэтай задачай перабудова ўсіх вясковых організацый, уздым культуры пролетарыяту і проблема кадраў, задача палепшаньня партыйнага кіраўніцтва, ідэйнага ўзброеньня партыі, забясьпечаньня яе баяздольнасьці. Усе гэтыя задачы і зьявіліся програмай організацыйнай работы ЦК партыі.

Даклад тав. Кагановіча быў прысьвечан падрабязнаму высьвятленьню, як выконваліся гэтыя задачы у організацыйнай рабоце ЦК і што прадстаіць партыі зрабіць у гэтай галіне ў далейшым.

Даклад тав. Кагановіча неаднакраць прарываўся аплёдысмэнтамі.

Па сканчэньню дакладу зьезд наладзіў тав. Кагановічу авацыю.

Вячэрняе паседжаньне адчыніцца дакладам Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Мы былі і застаёмся цьвёрдымі і ўстойлівымі бальшавікамі

Тав. Кушнер. Па даручэньню чырвонафлётцаў, камандзіраў і політработнікаў чырвонаштандартнага Балтыйскага флёту дазвольце мне перадаць выпрабаванаму, вернейшаму, надзейнейшаму барацьбіту за будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне, надзейнейшаму правадыру Савецкага Саюзу—ленінскай партыі ў асобе XVI зьезду баявое чырвонафлёцкае прывітаньне! (Аплёдысмэнты)

XVI зьезд партыі зьбіраецца ў важнейшы гістарычны момант, у той момант, калі партыя разгортвае пераможнае соцыялістычнае будаўніцтва, у той момант, калі партыя дабілася найвялікшага пералому ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Гэтыя гіганцкія посьпехі тлумачацца тым, што партыя і яе Цэнтральны камітэт цьвёрда трымалі ў руках штурвал карабля соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі тлумачацца тым, што партыя і яе ЦК беспамылкова праклалі курс к выкананьню ленінскіх запаветаў, зруйнаваўшы ўсякія спробы і „зьлева“ і справа перашкодзіць пераможнаму соцыялістычнаму будаўніцтву. Мы ведаем, што зараз наскокі правых і „левых“ на партыю паралічваюцца. Тыя шматлікія нікчэмныя праявы правых настрояў, якія былі ў нас, мы зруйнавалі да канца. Мы, маракі, запэўніваем зьезд, што былі і застаёмся цьвёрдымі і ўстойлівымі бальшавікамі.

Нашы посьпехі робяць рэальнай небясьпеку вайны супроць Савецкага Саюзу. Ні на хвіліну не забываючы аб гэтым, мы ўзмацняем магутнасьць і баяздольнасьць Чырвонага флёту. Мы цьвёрдай рукою вядзем нашы караблі. Мы пільна сочым за аховай нашых межаў. І мы запэўніваем партыю, ЦК, што ў любы момант па першаму заклiку Цэнтральнага Камітэту мы гатовы выступіць супроць любога праціўніка, які паспрабуе перашкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву. (Выкрыкі з месца: „Няхай жыве Чырвоная армія!“ „Ура!“, „Няхай жыве Чырвоны флёт!“).

Мы маем буйныя дасягненьні ў павышэньні нашай баяздольнасьці.

Маракі Чырвонай Балтыкі былі ў Кастрычнікавую рэволюцыю вернейшым ударным атрадам партыі. Уладзімір Ільліч гаварыў: у самыя небясьпечныя, і ў самыя цяжкія моманты пасылайце маракоў. Гэтыя слаўныя традыцыі рэволюцыйных маракоў Чырвонай Балтыкі мы захоўваем цалкам. Мы перадалі іх сотням і тысячам моладзі, якая выхавалася і выхоўваецца ў шэрагах нашага флёту. (Аплёдысмэнты). Мы гатовы ў любую хвіліну даць гэтых барацьбітоў на абарону межаў нашага Саюзу.

Няхай жыве комуністычная партыя!

Няхай жыве яе ленінскі цьвёрды ЦК!

Няхай жыве наш любімы правадыр тав. Сталін! (Працяжныя аплёдысмэнты. Ура!)

ПАЛАЖЫЦЬ КАНЕЦ НАСКОКАМ НА ЛІНІЮ ПАРТЫІ З БОКУ КУЛАЦКАЙ АГЭНТУРЫ—ПРАВЫХ УХІЛІСТЫХ—

ГЭТАГА ПАТРАБУЮЦЬ ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ І МАСЫ ПРОЛЕТАРЫЯТУ

Непахісна, буйнымі крокамі ідучы па шляху будаўніцтва соцыялізму, рашуча выкарчоўваючы рэшткі капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам свайго авангарду —комуністычнай партыі, дасягнула нябачаных посьпехаў. Гэтыя посьпехі, асабліва ў галіне індустрыялізацыі краіны і, у зьвязку з гэтым,—у колектывізацыі сельскай гаспадаркі, зьяўляюцца відочным паказчыкам правільнасьці генэральнай лініі партыі і лепшым абвяржэньнем права-ўхілісцкіх капітулянцкіх тэорый аб раўнаньні па „вузкія месцы“, аб нерэальнасьці ўзятых тэмпаў і г. д. Прайшоўшыя партыйныя конфэрэнцыі, сходы ячэек, на якіх прапрацоўваліся тэзісы да зьезду, з выключным адзінадушшам і рашуча падкрэсьлівалі, што партыя і яе ЦК праводзілі зусім правільную лінію, концэнтруючы агонь на правым ухіле, як галоўнай небясьпецы. Гэта пацьвярджаецца ўсім вопытам дзьвёх гадовай барацьбы.

Рашуча ўдарыць па наскоках па лінію партыі

У час правядзеньня партыйных конфэрэнцый, прапрацоўкі тэзісаў мы мелі ў шэрагу месц актывізацыю правых элемэнтаў, якія вуснамі Мамаева заяўляюць, што „нашы магчымасьці не адпавядаюць узятым тэмпам колектывізацыі“—вось наскрозь опортуністычная, вядомая ўжо партыі тэорыя: „лягчэй на паваротах“, „не сьпяшайцеся з колектывізацыяй, дайце кулаку мірна ўрасьці ў соцыялізм“.

І тут, як ніколі, яскрава вымалёўваецца нічым не прыкрыты твар клясава варожага кулацкага агента.

Аб ажыўленьні дзейнасьці правых опортуністых сьведчыць цэлы шэраг паасобных выступленьняў на сходах партыйных ячэек і ў нас на Беларусі.

Так, на адчыненым сходзе ячэйкі КП(б)Б прадпрыемстваў БДВ, пры абмеркаваньні пытаньня аб вылазцы правых у прадзьездаўскай дыскусіі, мела месца выступленьне правага опортуністага Зарха, які абараняючы погляды Мамаева, заявіў, што „ЦК не рэагаваў на перагібы, і што ў памылках колгаснага будаўніцтва вінават ЦК. Самакрытыка ў партыі адсутнічае, трэба ў сялянства шукаць залатую сярэдзінку.

Вось выпрабаваная, знаёмая песенька, выцягнутая з арсэналу опозыцыйнай барацьбы супроць ЦК, супроць лініі партыі.

Прысутныя, як партыйцы, так і беспартыйныя рабочыя, у сваіх выступленьнях далі рашучы адпор паклёпніцкаму антыпартыйнаму выступленьню правага опортуністага і ў вынесенай рэзолюцыі „сход з усёй рашучасьцю асуджае праваопортуністычнае выступленьне на партыйным сходзе ня члена нашага партыйнага колектыву Зарха з нападкамі на ленінскі ЦК, у абарону артыкулу Мамаева. Сход заяўляе, што гэта выступленьне ёсьць адлюстраваньне ідэолёгіі нашых клясавых ворагаў і павінна атрымаць рашучы адпор“. Пры абгаварэньні тэзісаў да XVI партзьезду, як паведамляе карэспондэнт Чарны, у ячэйцы Віцебскага сельсаюзу мела месца праваопортуністычная вылазка групы партыйцаў, на чале з сакратаром ячэйкі Кадышавым, які заявіў, што «пролетарская рэволюцыя ў нас закончана ў Кастрычніку“. Кадышаў імкнуўся давесьці, што раскулачваць ня варта бо ўсёроўна раскулачаных усіх (?) павароча́лі.

Кадышаву паддаквае Радзівонаў, заяўляючы, што „колектывізацыя гэта пыл“. Вось тут і высоўваецца з вушамі кулацкі абаронца правых, капітулянт, які-б хацеў, каб кулацтва не ліквідавалі, як клясу на аснове суцэльнай колектывізацыі, а далі яму магчымасьць „урастаць у соцыялізм“ і „карміць“ савецкую ўладу хлебам, бо колектывізацыя па яго думцы—„пыл“. Гэтыя выступленьні не атрымалі своечасовага адпору з боку ячэйкі. Толькі пасьля таго, як справай заняўся РК, Кадышаў зьнят з пасады сакратара ячэйкі і прызнаў свае памылкі.

„Альбо—альбо“

Разьбіваючы правы опортунізм, перамагаючы і „левыя“ троцкісцкія рэцыдывы, партыя да XVI зьезду прышла спаянай ленінскім адзінствам.

Выказваючы сваё поўнае давер'е партыі і яе ЦК пролетарыят гудкамі Сталінградзкага трактарнага заводу, Сельмашбуду, стварэньнем соцень і тысяч ударных брыгад, перадачай лепшых рабочых у партыю вітае XVI зьезд. Добра ўсьвядоміўшы ўсю небясьпечнасьць правага ўхілу, партыйныя масы разам з пролетарыятам Савецкага Саюзу зараз патрабуюць ад зьезду рубам паставіць пытаньне „альбо, альбо“ перад правымі ўхілістымі. Аб гэтай вялікай клясавай сьвядомасьці рабочых і ленінскім адзінстве шэрагаў партыі сьведчаць тыя пастановы, што выносяцца партыйнымі і рабочымі сходамі.

Ніводнага кроку ад лініі партыі

Агульны сход колектыву КП(б)Б чыгуначнай станцыі (Менск) вітае зьезд, які сабраўся ў час разгорнутага соцыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты. Вітае правадыра партыі — тав. Сталіна. Сход парт-колектыву з вялікім задавальненьнем адзначае, што партыя Леніна, пад кіраўніцтвам ЦК, прышла да свайго 16 партзьезду, як ніколі адзінай, вядучы няпрымірымую барацьбу супроць правага опортунізму і „левых“ загібаў.

Такое становішча прымусіла правадыроў правай опозыцыі фармальна капітуляваць перад партыяй. Але-ж па сутнасьці яны ўвесь час працягвалі рабіць наскокі на генэральную лінію партыі, што асабліва ўзмацнілася напярэдадні адчыненьня 16 партзьезду.

Агульны сход патрабуе ад 16 партзьезду рашуча паставіць пытаньне перад імі аб несумяшчальнасьці прабываньня ў шэрагах ленінскай партыі з вядзеньнем фракцыйнай працы.

Ніводнага кроку ад генэральнай лініі партыі!

„Альбо з партыяй, альбо партыя зьмяце вас з свайго шляху“

Парторганізацыя БДУ заклікае парторганізацыі вышэйшых навучальных устаноў (Цімірязеўскую Сельска-гаспадарчую Акадэмію, МДУ, Горацкую С.-Г. Акадэмію і інш.), дзе за апошні час мелі месца выступленьні правых ухілістых, зьяднацца яшчэ больш вакол нашага ЦК, больш напружана працаваць у напрамку выкананьня дырэктыў партыі па ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

Сход партколектыву БДУ патрабуе ад 16 партзьезду рашуча паставіць перад лідэрамі правых, а таксама перад усімі правымі ўхілістымі і прымірэнцамі, як кулацкімі агэнтамі ў шэрагах партыі, пытаньне: „альбо—альбо“, альбо з партыяй — за генэральную лінію, альбо партыя зьмяце вас з свайго пераможнага шляху пабудовы соцыялізму, выкіне з сваіх шэрагаў, як людзей, якія тармозяць справу пролетарскай рэволюцыі ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве 16 зьезд УсеКП(б)!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) і нястомны правадыр нашай партыі —тав. СТАЛІН!

Адчыненьне XVI зьезду УсеКП(б)



1. т. Варашылаў, Сталін, Калінін, Енукідзе.

ЛІСТЫ З ШКЛОЗАВОДУ КАСТРЫЧНІК

ЧУЖЫЯ ПЛЫНІ

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КОРЭСПОНДЭНТА)

У першы-ж дзень майго прабываньня на заводзе я сустрэўся з хадакамі па сялянскім пытаньням. Хадакі—гэта рабочыя шклозаводу, якія бываюць ці жывуць у вёсках і на завод прыходзяць, каб перадаць пражыцьцё вёскі. Часамі, а нават у большасьці выпадкаў, яны прыносяць на завод хворыя антыколгасныя настроі. Часамі „хадакі“ зьяўляюцца паўпрэдамі кулака на заводзе.

Ваколічныя вёскі кладуць свой адбітак на заводзкі пасёлак. Каля кожнай хаты—маленькі агародчык. Рабочыя заводу маюць 120 кароў. Інстынкт дробнага ўласьніка жыве яшчэ ў рабочым асяродзьдзі заводу.

Зараз ужо няма кустовай сямейнасьці, якая была выяўлена ў часе справы Баршай. Але-ж і на сёньнешні дзень сямейнасьць дае сябе тут можна адчуваць. У паасобных партыйцаў і комсамольцаў сямейнасьць часамі перарастае ў фракцыйную дысцыпліну.

Цэхаўшчына

На заводзе яшчэ і дагэтуль пануе „культ“-барады. Больш пажылога чалавека можа і няважнага працаўніка, хутчэй куды-небудзь высунуць, чымся якога-небудзь маладога таварыша, больш здольнага, але вінаватага ў тым, што ў яго няма барады.

Трэба, каб быў таварыш пажылы і абавязкова „шкляр“. Далёка хадзіць за прыкладамі ня трэба. У час апошніх перавыбараў бюро партколектыву, пры галасаваньні кандыдатуры б. сэкратара партколектыву Тышкевіча, на яго паступіў адзін такі адвод:

— Ён-жа ня наш, а чыгуначнік.

І гэта ня было выпадковасьцю. Такія факты сьведчаць аб тым, што няма яшчэ поўнага і яскравага разуменьня пытаньняў пролетарскай салідарнасьці еднасьці ня толькі сярод асобных рабочых, але і некаторых партыйцаў і комсамольцаў.

Дырэктывы партыі не для нас

Дырэктывы партыі аб правядзеньні беларусізацыі на заводзе не знашлі свайго праламленьня. У галіне беларусізацыі, як сродку ўзмацненьня дыктатуры пролетарыяту, асабліва на шклозаводзе, які пачыль а зьвязан з вёскай, пануе пасыўнае супраціўленьне

Партыйны колектыў заводу дагэтуль яшчэ нічога конкрэтнага не зрабіў у галіне беларусізацыі рабочых. На пасяджэньні бюро партколектыву толькі адзінкі гавораць на беларускай мове, астатнія „жарацъ“ па-расійску, у пратаколах-жа ўсе пішуць на белмове.

Партыйная маса заводу ня ўжывае беларускае мовы, нават наадварот,—лічыць яе нейкай чужой і незразумелай.

У культурна-масавай рабоце, за рэдкім выключэньнем, пануе расійская мова.

Партколектыў заводу і яго бюро ігноруюць дырэктывы партыі аб правядзеньні беларусізацыі.

Пасыўнае супраціўленьне беларусізацыі, махровы вялікадзяржаўны расійскі шовінізм, адсутнасьць культурна-масавай работы на нацменах (польскай і яўрэйскай) такі ганебнейшы баланс работы партколектыву ў нацпытаньні.

Скідка на несьвядомасьць

Паасобныя партыйцы і комсамольцы, за малым выключэньнем, скрозь пальцы глядзяць на недахопы заводу. Часамі яны цягнуцца ў хвасьце настрояў астатніх рабочых, і замест таго, каб даць адпор хворым настроям і разьвіць здаровую крытыку недахопаў, ня робяць ні таго, ні другога.

Было-б памылкова абвінавачваць усю партыйную і комсамольскую організацыю заводу, але шэраг фактаў антыпартыйных настрояў і спраў застаецца няпрыкмечаным, а часамі ня прыкмечаныя факты робяць скідку на несьвядомасьць, на малую разьвітасьць.

На адным з пасяджэньняў бюро партколектыву партыец дзесятнік Нэронскі па пытаньнях недахопаў вытворчасьці заявіў:

— Ды што там, нас толькі і ведаюць, што ганяць.

Антыпартыйнага выступленьня Нэронскага ніхто ня прыкмеціў.

Комсамолка Бэрнштэйн — работніца малярнага цэху—выступае на рабочым сходзе супроць падпісаньня індывідуальных соцумоў.

Тварам да... цыркуляраў

Да апошніх часоў комсамольская організацыя заводу займалася ўсім, толькі ня пытаньнямі вытворчасьці, выкананьнем прамфінпляну, разгортваньнем соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

І нават зараз, пасьля таго, як прадстаўнікі Бабруйскага АК у працягу амаль месяцу працавалі на заводзе па гэтых пытаньнях, усё-ж цэхавыя партыйныя і комсамольскія ячэйкі не займаюцца як сьлед пытаньнем вытворчасьці.

Як-жа кваліфікаваць такое зьявішча, калі цэхпарт'ячэйкі 4-й зьмены выдувальнага цэху і шляфіркі ня ведаюць нават хто ў іх зьяўляецца ўдарнікам. Большасьць цэхавых ячэек, як партыйных, так і комсамольскіх, ня кіруюць як сьлед соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Сакратары цэхавых парт'ячэек чакаюць пакуль прыдуць да іх работнікі партколектыву і падрыхтуюць іх што-небудзь зрабіць, ці нават лепш таго,—зробяць за іх.

Сакратары чакаюць...

— Вось—Тышкевіч (сэкратар партколектыву) ці Казіміраўская (культпроп.) прыдуць, дык яны і зробяць.

— Добра сказаць зрабі! Мы-ж працуем у зьмене хай робяць тыя, хто на „халодным“ рублі.

На „халодным рублі“ працуюць аслабанёныя работнікі колектыву КП(б)Б, комсамолу заўкому і заводакіраўніцтва. На „гарачым рублі“ працуюць толькі шклодувы і ніхто іншы.

„Нам прышываюць опортунізм“

Партколектыў і колектыў комсамолу, падагульняючы вынікі работы, прызналі, што комсамольская організацыя заводу дайшла да беспрынцыпов гадзяляцтва і правага опортунізму на практыцы

Але кіраўніцтва колектыву ўпарта не жадала прызнаваць сваіх памылак. Былы сэкратар колектыву Дружынскі апэлюе на бюро колектыву. Ён заяўляе па адрасу прадстаўнікоў Бабруйскага АК ЛКСМБ:

— „Нам прышываюць опортунізм“.

Зараз Дружынскі працуе на вытворчасьці. Калі яму даюць другую адносчыцу замест той, якая ў яго была раней, ён ледзь не выклікае забастоўку на варштаце. Дружынскі крычыць па адрасу цэхавай адміністрацыі:

— Як на нас выяжджаюць, так і мы будзем выяжджаць.

Дружынскага перамайюць беспартыйныя рабочыя. Выкліканы на бюро партколектыву, ён ўпарта не жадае прызнаць сваіх памылак. Але гэта яшчэ ня ўсё. Выступленьне комсамольцаў на апошнім сходзе паказала твар яшчэ і таго Дружынскага, які вядзе склоку супроць бюро колектыву. Колектыў комсамолу лічыць немагчымым пасылку Дружынскага на курсы комсамольскага актыву. Ён акрамя шкоды ніякай карысьці на кіруючай працы ня зможа даць.

Рашуча біць па правых праявах і „левацкіх“ заскоках

Прамфінплян, соцспаборніцтва нямо[ж]уць чакаць аніводнае хвіліны. За прарывы на вытворчасьці ў першую чаргу нясуць адказнасьць партыйная і комсамольская організацыі. Яны ў роўнай ступені і побач з заводам знаходзяцца на чорнай дошцы. Адказнасьць за прарывы няхай нясуць ня толькі кіраўнікі, але і ўвесь рабочы колектыў. Партыйны і комсамольскія колектывы абавязаны хутка і рашуча біць па „левацкіх“ заскоках і асабліва праявах правага опортунізму памятаючы, што гэта галоўная ўмова пасьпяховага выкананьня пастаўленай партыяй задачы.

Ал. Ліпаёвы,

Пас. Елізава, Бабруйшчына.

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ ВІНАВАТЫХ У БЯСЧЫНСТВАХ ПА ЗАГАТОЎЦЫ СУРУКАЎ ДЛЯ СУШКІ ТАБАКОЎ

АДЧЫНЕНЫ ЛІСТ ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ

Дарагія таварышы!

Крымтабакколгассаюз у лютым месяцы г. г. заключыў з Саюзлесам дагавор на пастаўку 650000 штук табачных сурукаў.

Загатоўка гэтых сурукаў была ўскладзена на Лесбел і МББ чыгункі. На атрыманьне сурукаў Крымтабакколгассаюзу былі выданы нарады за №№ 2083 і 2084.

Куды адгружаць сурукі ў красавіку і маі Крымтабакколгассаюз паведаміў Беларускай канторы Саюзлесу лістом ад 31/3 за № 40518 і лістом ад 26/4 за № 40526. У гэтых лістох Крымтабакколгассаюз прасіў на загатоўку сурукаў зьвярнуць належную ўвагу, бо неатрыманьне сурукаў ва ўстаноўленыя дагаворам тэрміны, г. зн. у красавіку, маі і чэрвені роўнымі часткамі павядзе да зрыву ўборкі і пагібелі табакоў, у тым ліку і экспортных. У гэтых-жа лістох Крымтабакколгассаюз прасіў захоўваць памеры сурукаў, устаноўленыя дагаворам і ўказанныя ў нарадах № 2083 і 2084. (Даўжыня 4,2 мэтра і таўшчыня ў верхнім адрубе 3-4 сантымэтры)

Не атрымаўшы адказу на першы ліст, Крымтабакколгассаюз 5/4 тэлеграмай № 257 запрасіў аб пачатку адгрузкі сурукаў. У адказ на ліст і тэлеграму Крымтабакколгассаюзу, Беларуская Кантора Саюзлесу за подпісам кіраўнічага т. Ардашнікава прыслала Крымтабакколгассаюзу ліст, датаваны 12/4 за № 090-45, у якім паведамлялася аб вылучэньні Лесбелам у трэці квартал 600.000 штук сурукаў і прасіла выслаць разнарадкі, куды сурукі накіроўваць.

Патрабаваньне разнарадак, якія як указана вышэй, Крымтабакколгассаюзам былі накіраваны своечасова, указвала на няўвязкі ў апараце Саюзлесу, а таму Крымтабакколгассаюз сваім лістом ад 17/4 за № 40522 паведаміў аб тым, што разнарадкі накіраваны і прасіў тэлеграфаваць ці атрымоўваюцца яго лісты.

Не атрымаўшы ніякага адказу на лісты ад 17/4 і 26/4, Крымтабакколгассаюз 29/4 і 5/5 тэлеграфаваў Беларускай канторы Саюзлесу, прычым ва ўсіх лістох і тэлеграмах Крымтабакколгассаюз указваў на сур'ёзнасьць становішча і на пагрозу зрыву ўборачнай кампаніі табакоў.

У далейшым Крымтабакколгассаюз колькі небудзь пэўнага адказу ад Беларускай канторы Саюзлесу так і ня меў.

Кантора 5/5 паведаміла, што адгрузка сурукаў пачнецца толькі з 15/6, а 7/5—што маецца гатовых да адгрузкі сурукаў 20.000 штук, што загатоўка працягваецца і г. д.

Лічачы недапушчальнымі абыякія адносіны апарату Саюзлесу, Крымтабакколгассаюз камандыраваў свайго прадстаўніка ў Менск. Па паведамленьню гэтага прадстаўніка адносіны Саюзлесу і Лесбелу да загатоўкі і адпраўкі сурукаў самыя бясчынныя і мяжуюцца з шкодніцтвам.

Сваім апошнім лістом ад 4/6 за № 5-536, у адказ на службовую запіску прадстаўніка Крымтабакколгассаюзу, Беларуская кантора Саюзлесу паведаміла, што на станцыях маецца гатовых да адпраўкі сурукаў да 250000 штук і што к 1/7 будзе адгружана 400000 штук.

Прадстаўнік Крымтабакколгассаюзу, аб'ехаўшы месцы загатоўкі сурукаў, паведаміў што даныя гэтага ліста зусім не адпавядаюць сапраўднасьці.

Становішча з сушкай табакоў у выніку адсутнасьці сурукаў самае катастрафічнае. Значная частка ўраджаю табакоў будзе кінута на пагібель, калі ўсе 650000 штук сурукаў ня будуць адгружаны да 15-20 ліпеня.

Пагібельлю табакоў будзе нанесена вялікая страта экспорту і падрыў колектывізацыі.

Просім прыцягнуць да гэтай вельмі сур'ёзнай справы ўсю комсамольскую масу і грамадзкасьць, **асудзіць нядбайныя адносіны апарату Саюзлесу да гэтай вельмі ўдарнай справы.**

Адкуль павінны адгружацца сурукі Крымтабакколгассаюзу вы даведаецеся ад Беларускай канторы Саюзлесу, а таксама ад прадстаўніка Крымтабакколгассаюзу т. Сіліна.

Просім зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць і памеры сурукаў, бо з паступаючых у Крым сурукаў адгружаецца вялікая колькасьць браку, нягоднага для вытворчасьці.

Аб прынятых вамі мерах просім паведаміць.

З комсамольскім прывітаньнем сэкратар АК ЛКСМ Крыму СКАМАРОХАЎ.

За плянавую падрыхтоўку кадраў

Мы да гэтага часу ня маем новай пяцігодкі падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых для народнай гаспадаркі. Невядомы дакладна патрэбы розных галін народнай гаспадаркі ў спэцыялістых. Далёка ня поўна выяўлены патрэбы паасобных раёнаў і, у прыватнасьці, нашых акраін у спэцыялістых наогул і паасобных кваліфікацыях у прыватнасьці.

Той плян, або вярней кажучы, чарнавы накід пляну, які быў распрацаваным у маі 1930 году і прадстаўлен на разгляд ураду—аказаўся яўна нездавальняючым таму, што ён ні з колькаснага, ні з якаснага боку не вырашаў праблемы падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі.

Пры ўсё ўскладняючымся кіраўніцтве паасобнымі галінамі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі наўрад ці можа быць прынятым такі плян, які прыводзіць нас **к канцу пяцігодкі з вялізарным дэфіцытам** у спэцыялістах. Па гэтаму пляну ў РСФСР павінна не хапіць 80.000 сельска-гаспадарчых спэцыялістых, звыш 100.00 спэцыялістых па прамысловасьці. Гэты куцы проэкт новай пяцігодкі кадраў не дае магчымасьці перамагчы цэлы шэраг іншых цяжкасьцяй, якія ўзьнікаюць у нашых новаўзрастаючых экономічных раёнах і асабліва нацыянальных абласьцёх і рэспубліках. Тыя якасныя зьмены, якія павінны адбыцца ў падрыхтоўцы новых спэцыялістых, не знашлі тут свайго адлюстраваньня.

Усё гэта пабудзіла ўрад адкласьці разгляд канчатковага пляну падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых на тры месяцы. Для адказнага і вялікага заданьня па перагляду сваёй кадравай пяцігодкі—тры месяцы—тэрмін, бязумоўна, вельмі кароткі. Трэба, не марудзячы ніводнага дня паставіць на абгаварэньне шырокай грамадзкасьці ўсе паасобныя часткі адзінага пляну кадраў. Пры гэтых умовах мы пазьбегнем тых многіх і вельмі істотных недахопаў, на якія хварэе сучасны проэкт.

ВНУ і тэхнікумы павінны апірацца на буйныя фабрыкі, заводы, саўгасы і колгасы.

У новай пяцігодцы неабходна выходзіць з таго, што ВНУ і тэхнікумы павінны **разгортвацца і апірацца на буйныя фабрыкі, заводы, савгасы і колгасы.** Падрыхтоўка спэцыялістых у непасрэднай сувязі з вытворчасьцю дасьць магчымасьць выпускаць з сьцен ВНУ і тэхнікумаў маладых спэцыялістых, якія могуць зараз-жа прыступіць да выкананьня адказнай кваліфікаванай работы. Пры садзейнічаньні нашай грамадзкасьці трэба выявіць тыя перадавыя прадпрыемствы і колгасы, якія могуць быць ператвораны ў прадпрыемствы—ВНУ, савгасы тэхнікумы.

Пытаньне аб далейшым будаўніцтве новых ВНУ і тэхнікумаў пры прамысловых прадпрыемствах і савгасах вырашан урадам у станоўчым сэнсе.

Гэта мерапрыемства абяцае нам вялікія пэрспэктывы, асабліва ў сувязі з задачай дадатковага абучэньня вялікіх пластоў кваліфікаваных рабочых. Неабходна мець на ўвазе, што пры ўсіх умовах наша вышэйшая школа поўнасьцю не пакрые патрэбнасьці ў спэцыялістых народнай гаспадаркі. Таму, сталае вылучэньне і абагачэньне тэорэтычнымі ведамі найбольш перадавых кваліфікаваных рабочых на самых прадпрыемствах зьяўляецца магутным сродкам вырашчваньня неабходных нам тэхнічных кадраў. Калі ўмеючы паставіць гэтую справу і зацікавіць ёю кваліфікаваных рабочых, дадатковае абучэньне робочых прыме масавы характар.

З бягучага году значна пашыраецца прыём у вышэйшыя школы і тэхнікумы. Надышла „страдная“ пара падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Трэба прыкласьці ўсе сілы к таму, каб прапусьціць праз курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ у першую чаргу кваліфікаваных рабочых, якія жадаюць вучыцца. Такія курсы і зараз ёсьць, але іх, па-першае, мала, а потым яны недаступны для тэй катэгоры кваліфікаваных рабочых, якія ня могуць адарвацца ад вытворчасьці. Зусім новым у практыцы падрыхтоўкі студэнцтва зьяўляецца дырэктыва Саўнаркому **аб організацыі такіх курсаў непасрэдна на самых прадпрыемствах,** прычым вучні, не адрываючыся ад вытворчасьці, змогуць падрыхтаваць сябе да паступленьня ў ВНУ. Гаспадарчыя органы павінны зараз-жа прыступіць да ўтварэньня такіх курсаў.

Дабіцца, каб бедняк[і] і батракі складалі большасьць вучняў у с. г. ВНУ і тэхнікумах

У нашу вышэйшую і сярэднюю сельска-гаспадарчую школу ўсё яшчэ надзвычайна слаба ўцягнуты сельска-гаспадарчыя рабочыя, сяляне-беднякі і колгасьнікі. Гэта тлумачыцца тым, што недастаткова матар'яльная забясьпечанасьць вучняў, слаба вядзецца падрыхтоўка гэтых блізкіх нам соцыяльных пластоў вёскі ў вышэйшую школу. Неабходна дабіцца таго, каб беднякі і батракі складалі пераважную большасьць вучняў у нашых с.-г. ВНУ і тэханікумах. Гэта патрабуе дадатковых затрат, але яны павінны быць зроблены ў інтарэсах якасьці будучых сельска-гаспадарчых спэцыялістых.

Падвойнае, а мясцамі патройнае павялічэньне прыёму ў ВНУ і тэхнікумы, ня будзе, зразумела, праходзіць толькі за лік пабудовы новых навучальных установ. На гэта-б не хапіла ні сродкаў, ні сіл, ды і наўрад ці гэта мэтазгодна. Ёмістасьць ВНУ і тэхнікумаў трэба пашыраць другімі шляхамі. Двухзьменныя заняткі, бесьперапынку, скарачэньне тэрміну навучаньня—усё гэта будзе садзейнічаць найбольш мэтазгоднаму і поўнаму выкарыстаньню педагогічных сіл, вучэбнага абсталяваньня і г. д.

Пяцігодка кадраў на новай пашыранай базе, якая праз некалькі месяцаў будзе канчаткова зацьвярджацца ўрадам, павінна быць шырока прапрацавана нашай профсаюзнай і навуковай грамадзкасьцю на фабрыках, заводах, у савгасах і буйных колгасах.

М. Ц'эйнін.

Арганізаваць усебеларускі налет

для праверкі гатоўнасьці ўсіх арганізацый гораду і вёскі да ўборкі ўраджаю

Весткі з месц сыгналізуюць аб тым, што: падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі ідзе марудна, сельска-гаспадарчыя машыны не рамантуюцца, пляны ўборкі ня складзены, колгасы і індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі дзе-ні-дзе не атрымалі сенажаці

Камітэты, ячэйкі, атрады „лёгкай кавалерыі“, прывядзеце сябе ў баявую гатоўнасьць!

НАЛЁТ—ШТУРШОК У СПРАВЕ ЛЕПШАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ УБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Правядзеньне ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі мае вялікае значэньне ў сэнсе замацаваньня дасягнутых посьпехаў, далейшага разгортваньня колгаснага руху і ажыцьцяўленьня політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі.

Гэта зусім зразумела.

Бедня́кі і серадня́кі, якія яшчэ ня ўступілі ў колгас, альбо па тэй ці іншай прычыне вышлі з колгасаў, зараз з вялікай пільнасьцю сачаць за кожным крокам работы колгасаў і ў значнай ступені ў залежнасьці ад пасьпяховасьці правядзеньня ўборкі ўраджаю, асабліва колгасамі, яны будуць вырашаць пытаньне аб тэрміне далейшага прабываньня па-за колгасамі.

Зусім яснымі зьяўляюцца тыя задачы і пэўна вызначаецца тая роля, якую павінен адыграць комсамол у правядзеньні ўборачнай кампаніі.

На гэтым вучастку, як ніколі, патрабуецца ўдарнасьць, бальшавіцкія тэмпы работы.

Якасьць правядзеньня ўборкі знаходзіцца ў простай сувязі і залежнасьці ад якасьці правядзеньня падрыхтоўчай работы. На гэтым вучастку зараз справа абстаіць якраз нездавальняюча, а ў шэрагу месц зусім дрэнна.

Мы зьяўляемся сьведкамі фактаў, што ў шмат якіх мясцох яшчэ не адведзены сенажаці, не рамантуюцца машыны, няма ніякіх меркаваньняў наконт расстаноўкі сіл, організацыі работы па ўборцы ў колгасах. Не растлумачаны пастановы ўраду аб разьмеркаваньні прыбыткаў ураджаю ў колгасах, аб колькасьці, якую неабходна здаць дзяржаве, што прыводзіць да шкодных настрояў сярод колгасьнікаў і ў шэрагу месц скарыстоўваецца кулаком у яго барацьбе супроць колектывізацыі.

Яшчэ да гэтага часу ня ўсюды КСУ, колгасы, саўгасы вытворчыя коопэрацыйныя таварыствы, складзены падрабязныя рабочыя пляны, якія паказвалі-б тэрмін зборкі паасобных культур, колькасьць рабочай сілы, скарыстаньне машын і г. д.

ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ у сваіх дырэктыўных лістох далі зусім выразныя і поўныя пакazаньні, над правядзеньнем якіх у жыцьцё павінна працаваць уся організацыя. Не гаворачы, у зьвязку з гэтым, аб усіх задачах кожнай ячэйкі, ударнай брыгады і г. д., мы лічым неабходным заастрыць увагу організацыі на правядзеньне важнейшага масавага мерапрыемства, у зьвязку з падрыхтоўкай да ўборкі. ЦК ЛКСМБ прыняў пастанову аб правядзеньні масавай праверкі падрыхтаванасьці організацый і ўстаноў да ўборкі ўраджаю, асеньняй сяўбы і сілосаваньню шляхам налётаў „ЛК“. Гэта мерапрыемства павінна быць праведзена паміж 30-VI і 7-VII—1930 г.

„Ч. З.“ з свайго боку прапануе абвясьціць усебеларускі налёт „лёгкай кавалерыі“ як у горадзе, так і вёсцы, на ўстановы, якія непасрэдна зьвязаны з работай па ўборцы ўраджаю і сілосаваньню.

У горадзе: на земаддзелы, колгассаюзы, паляводсаюзы, КСУ, чыгуначныя майстэрні, якія павінны рамантаваць сельгасмашыны. На заводы па вырабу сельгасмашын, на склады сельгасмашын.

У раёнах і вёсках: на РВК, Акрколгассаюз, крэдытныя таварыствы, спажывецкія таварыствы, земаддзелы, КСУ, сельсаветы, саўгасы, колгасы.

З гэтай мэтай акруговыя і раённыя штабы павінны ў трохдзённы тэрмін правесьці адпаведную падрыхтоўчую работу, вызначыць шэраг пытаньняў, высьвятленьнем якіх павінны займацца атрады „ЛК“ пры налётах.

Пры налётах патрэбна высьветліць становішча па наступных асноўных пытаньнях:

1. Забясьпечанасьць машынамі і іх дастаўка;
2. Рамонт машын;
3. Распарадак работы машын з разьлікам максымальнага іх выкарыстаньня;
4. Становішча справы з адводам сенажацяй як колгасам, так і індывідуальным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам;
5. Падрыхтаванасьць машынна-конных станцый;
6. Ці маюцца пляны разьмеркаваньня рабочых дзён і сілы ў колгасах і саўгасах;
7. Ці растлумачаны рашэньні партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаяў і даходу ў колгасах;
8. Падрыхтаванасьць складаў для прыёмкі збожжа;
9. Організаванасьць работы па дапамозе маламоцным бядняцкім гаспадаркам.

Разам з гэтым, ва ўсіх вышэй паказаных установах праверыць становішча з сілосаваньнем; засевам сілосных культур, падрыхтоўкаю да капаньня ям, будаўніцтвам бакштаў, правядзеньнем 10-ці дзеньніка сілосаваньня, які абвешчан ЦК ЛКСМБ і НК Б.

Правядзеньне налёту павінна спадарожвацца ўзмоцненай работай с міх комсамольскіх ячэек вёскі і гораду па падрыхтоўцы і правядзеньню ўборачнай кампаніі.


Як налёт „ЛК“, так і выкананьне ўсіх рашэньняў ЦК УсеЛКСМ павінна праходзіць пры поўным удзеле мас комсамольцаў з бязумоўным выкананьнем рашэньняў ЦК аб тым, што „комсамольскія ячэйкі павінны быць ініцыятарамі соцспаборніцтва, як між колгасамі, саўгасамі, так і ўнутры апошніх—між паасобнымі брыгадамі“.

Налёт „ЛК“ павінен даць значны штуршок у справе хутчэйшай падрыхтоўкі і лепшага правядзеньня ўборкі ўраджаю.

З выкананьнем гэтага мерапрыемства марудзіць нельга.

СТАЛІНГРАДЗКІ ТРАКТАРНЫ ГІГАНТ

17-га чэрвеня а 3-й гадзіне дня ў мэханічна-зборачным цэху трактарнага заводу, у прысутнасьці дэлегатаў краявой партыйнай конфэрэнцыі і прадстаўнікоў заводаў і колгасаў, з конвэера быў зьняты першы трактар.



На здымку: Момант, калі колгасьнік падняў піонэра, які павінен нажніцамі перарэзаць істужку.

НА ЧОРНУЮ ДОШКУ ДЭЗЭРТЫРАЎ З ГАСПАДАРЧАГА ФРОНТУ

Ячэйка ЛКСМБ колгасу „Батрак“ адмовілася ад выкліку на соцспаборніцтва

У Слуцкім раёне шырока разгарнулася падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі.

Комсамольская ячэйка комсамольскага колгасу „КІМ“ выклікала на соцспаборніцтва комсамольскую ячэйку колгасу „Батрак“ па наступных пунктах:

1. **Зьнішчыць прагулы.**
2. **АДМОВІЦЦА НА ЎВЕСЬ ЧАС УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ АД ВЫХАДНЫХ ДЗЁН.**
3. **За лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі і організацыю працоўнай моладзі навакол гэтай важнейшай політычнай задачы.**

Трэба адзначыць, што комсамольская ячэйка колгасу „Батрак“ адмовілася ад выкліку. На сходзе комсамольскай ячэйкі, дзе разьбіралася гэтае пытаньне, комсамольцы ўцяклі са сходу. Вырашаць гэтую важнейшую політычную задачу застаўся толькі прэзыдыум з 4 асоб.

БАКШТЭЙН.

Саўгасы Заслаўшчыны не гатовы да ўборачнай кампаніі

Падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі ў саўгасах Заслаўскага раёну праходзіць вельмі слаба. Яшчэ ня складзены брыгады па агляду і рамонту сельска-гаспадарчых машын. Так, напрыклад, у саўгасе „Саломарэчча“ ёсьць два трактары, якія знаходзяцца зусім бяз догляду, стаяць пад дажджом і ня чысьцяцца, а таму часта псуюцца. У час вясеньняга севу былі вялікія прастоі трактароў з-за адсутнасьці гаручага. Вельмі дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі і ў саўгасе „Новы Двор“, у колгасе „Агрокультура“ і ў Заслаўскім мэліорацыйным таварыстве, дзе машыны знаходзяцца ў няспраўнасьці. Комсамольскія ячэйкі Заслаўскага раёну не ўдзяляюць ніякай увагі ўборачнай кампаніі.

В.

Да ўборкі рыхтуюцца слаба

Вясеньні сеў у колгасе імя „10-годзьдзя Кастрычніка“ Магілеўскай акругі закончыўся 10-га чэрвеня. Сеў быў закончан на некалькі дзён раней вызначанага тэрміну і прайшоў здавальняюча. У час сяўбы больш за ўсіх праявілі сябе дзяўчаты - комсамолкі: **Грышынава В., Малашкавы Г. і А., Цецярукова Г., Іванова і інш.** Гэтыя дзяўчаты ня лічыліся ні з якімі выхаднымі днямі, рэлігійнымі сьвятамі і працавалі лепш за ўсіх, па-ўдарнаму. Але, не гледзячы на гэта, праўленьне колгасу не падумала аб іх прэміяваньні.

Скончыўшы вясеньнюю пасеўную кампанію, колгас прыступіў да падрыхтоўкі глебы пад азімыя пасевы. Адначасова ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі. Але трэба сказаць, што праводзіцца яна вельмі слаба. Колгас мае адзін трактар „Фордзон“, які ніякай карысьці яму ня прыносіць.

Юнкор **М. Снапкоў.**

Поўнасьцю захаваць працоўны прынцып пры разьмеркаваньні прыбыткаў

(З артыкулу намесьніка старшыні Колгасцэнтру СССР т. Н. Татаева)

Ужо ў сучасны момант сярод колгасьнікаў і ў шэрагу організацый ідзе ўзмоцненае абгаварэньне пытаньня аб тым, якім парадкам будуць разьмяркоўвацца прыбыткі і сёлетні ўраджай у колгасах.

У сучасны момант цэнтральнымі ўрадавымі і колгаснымі органамі вынесена даволі пастаноў, якія даюць неабходныя дырэктывы аб падыходзе да разьмеркаваньня прыбыткаў і ўраджаю ў колгасах і ў першую чаргу ў іх асноўнай форме—у сельгаспадарчых арцелях.

Каб яшчэ раз аднавіць у памяці гэтыя рашэньні, мы лічым неабходным іх прывесьці для ўсеагульнага ведама і кіраўніцтва.

Аб аплаце працы і разьмеркаваньні прыбыткаў

„Аплата працы ў колгасах утвараецца выключна з вынікаў ураджаю і іншых прыбыткаў колгасу; аплата працы ўтвараецца натурай і грашыма, прычым катэгорычна забараняецца аплата працы колгасьнікам унутры колгасаў выключна грашыма. У аснову разьлікаў з колгасьнікамі па працадням кладзецца колькасьць і якасьць працы паасобнага колгасьніка альбо двара, згодна рашэньню агульнага сходу колгасьнікаў“ (пастанова НКЗ і Колгасцэнтру СССР, зацьверджаная ЦВК і СНК СССР ад 13-IV—30 г.).

Аб чым гаворыць гэтая пастанова? Яна гаворыць аб тым, што ў аснову разьмеркаваньня прыбыткаў між членамі колгасу (сельска-гаспадарчай арцелі) пакладзен працоўны прынцып. Гэта азначае, што ўдзельнікам па разьмеркаваньню прыбыткаў між сябрамі зьяўляецца той, хто прымае ўдзел у колгасе сваёй асабістай працай альбо працай членаў сям'і свайго двара. Прычым прыбытак колгасу разьмяркоўваецца ня толькі ў суадносінах з колькасьцю затрачаных працоўных адзінак, але і ў адпаведнасьці з якасьцю працы.

Імкненьні рэгуляваць разьмеркаваньне прыбыткаў між членамі колгасу, выключае працоўны прынцып і зьмяняе яго прынцыпам ураўнільна-спажывецкім (ядоцкім)—гэта азначала-б, што трэба перагледзець у самай сутнасьці організацыйна-гаспадарчую пабудову колгасаў і сельска-гаспадарчых арцеляй і, забіла-б стымул у сяброў колгасаў да падвышэньня вытворчасьці працы ўздыму таварнасьці колектыўнай гаспадаркі.

Працоўны прынцып пры разьмеркаваньні прыбыткаў павінен быць захован поўнасьцю.

У рашэньнях Наркомзему і Колгасцэнтру СССР ёсьць частковыя адступленьні ад гэтага прынцыпу.

Гэта пастанова Наркомзему і Колгасцэнтру СССР ня ўсюды даведзена да ведама колгасьнікаў, а ў шэрагу месц захавалася ў колгасна-коопэрацыйных апаратах і затрымліваецца бязумоўна ў шкоду колгаснаму будаўніцтву. У гэтай частцы пастановы Наркомзему і Колгасцэнтру ад 13-4-30г. зацьверджанай ЦВК і СНК СССР, гаворыцца:

„Прызнаць неабходным вылучэньне з валавога ўраджаю сельска-гаспадарчай арцелі і з іх прыбыткаў ад малочнае абагуленае жывёлы 5 проц для разьмеркаваньня між колгасьнікамі адпаведна маемасьці, якую кожны з іх унёс у абагулены фонд колгасу“.

Трэба пры разьмеркаваньні прыбыткаў гэта рашэньне поўнасьцю рэалізаваць. У практыцы шэрагу колгасаў пры абсьледваньні ўстаноўлена, што непадзельныя капіталы і абагуленыя фонды складаюцца не толькі ў памерах, паказаных па статуту, але перавышаюць яго максымальныя статутныя нормы.

На бягучы гаспадарчы год будзе зусім дастаткова, калі памеры непадзельных фондаў ад валавога прыбытку за выняткам з яго насеньня будуць складвацца прыкладна ў памеры 10 проц., а абагуленыя фонды—ў памеры 5 проц., прычым за кошт абагуленых 5-процантных фондаў трэба аднесьці выдаткі, зьвязаныя з аказаньнем дапамогі непрацаздольным сябром арцелі, культурна-бытавыя і іншыя выдаткі, г. ё. патрэбна ў непадзельныя і абагуленыя фонды адлічваць не максымальныя нормы, хоць яны і дапушчаны па статуту.

Разьмеркаваньне ўраджаю

Для колгасаў нязбожжавых раёнаў устанавіць здачу (продаж) таварнага хлеба па нормах, якія не перавышаюць $^{1}/_{8}$ часткі валавога збору зерня. Уся астатняя частка валавога збору, як ў збожжавых, так і ў нязбожжавых раёнах застаецца ў поўным распараджэньні колгасу“ (пастанова НКЗ і Колгасцэнтру СССР ад 13 мая г.г.).

З гэтага рашэньня зусім відавочна што пры разьмеркаваньні ўраджаю і яго натуральнай часткі перад колгасам у першую чаргу ўстаюць абавязкі здаць дзяржаве натуральную частку ўраджаю ў тым памеры, які ўстаноўлены ў пастанове Наркомзему і Колгасцэнтру ад 13-IV—30 г.

„Уся астатняя маса валавога збору як у збожжавых, так і нязбожжавых раёнах застаецца ў поўным распараджэньні колгасу“.

Аднак, трэба з усёй катэгорычнасьцю падкрэсьліць, што ўсякія спробы штучнага затрыманьня натуральнай часткі прыбытку (збожжа, продукты і інш.) у распараджэньні колгасу, не перадаючы яго ў якасьці прыбытку сваім членам, павінны быць рашуча асуджаны.

Адно павінна быць зусім ясна, і катэгорычна ўстаноўлена, што ўсе пастановы па пытаньню разьмеркаваньня ўраджаю ў колгасах між членамі павінны быць разгледжаны і зацьверджаны агульным сходам колгасьнікаў і прыняты іх большасьцю.

Пры разьмеркаваньні ўраджаю азімых культур, засеяных мінулай восеньню сябрамі с.-г. арцелі ў індывідуальным парадку, неабходна строга кіравацца наступным рашэньнем НКЗ і колгасцэнтру СССР, зацьверджаным ЦВК і СНК СССР: „Ураджай азімых культур, засеяных мінулай восеньню членамі с.-г. арцелі ў індывідуальным парадку належыць пасеўшчыкам. Пры абмалоце азімых культур, засеяных у паказаным парадку, частка сябранага зерна перадаецца пасеўшчыкамі загатоўчым органам, згодна дагавору кантрактацыі, частка ідзе ў насенны фонд арцелі, а таксама на аплату колектыўнай уборкі і абмалоту, а ўсё астатняе насеньне застаецца ў поўным распараджэньні пасеўшчыкаў. Прычым ніякіх іншых адлічэньняў у фонд колгасаў з азімых ня робіцца“.

Колгасна-коопэрацыйнае і партыйнае кіраўніцтва на мясцох павінны з максымальнай пільнасьцю і ўвагай уліч(ыць) пэрыод разьмеркаваньня ўраджайнасьці і прыбыткаў у колгасах і не пакінуць ніводнае колектыўнае гаспадаркі без непасрэднага абслугоўваньня шляхам выезду на месцы.

Ажыцьцяўляючы гэтыя важнейшыя мерапрыемствы ў колгасным будаўніцтве, мясцовыя, савецкія, партыйныя і колгасна-коопэрацыйныя організацыі і самі колгасьнікі павінны мець на ўвазе, што на аснове разьмеркаваньня прыбыткаў і ўраджаю кулак спрабуе ўнесьці разлад і дэзорганізацыю ў асяродзьдзе колгасьнікаў. Неабходна даць рашучы адпор спробам кулацтва.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

Сутычка рэволюцыйных рабочых з „ультрамарксыстымі“

Напад фашыстых з паліцыяй на конфэрэнцыю рабочых

ВЕНА, 26. У барацьбе супроць рэволюцыйнага рабочага руху грэцкая паліцыя стала карыстацца дапамогаю фашыстых. Так, у Салёніках, рабочы клюб, заснаваны нядаўна замест распушчанай „рабочай палаты“, (рэволюцыйнай організацыі грэцкіх рабочых) наладзіў нараду, у якой прынялі ўдзел каля 50 рабочых. Калі ўдзельнікі нарады сталі разыходзіцца, на іх напала сотня так званых „ультрамарксыстых“ (чытай—фашыстых) і жорстка зьбіла іх. Сутычка рэволюцыйных рабочых з „ультрамарксыстымі“ мела месца таксама і недалёка ад табачнай фабрыкі Мэляхрыноса ў Салёніках, прычым паліцыя затрымала двух рабочых.

19 чэрвеня організацыя компартыі ў Драме склікала конфэрэнцыю, у час якое ў памяшканьне ўварваліся паліцэйскія і фашыстыя. Рабочыя аказалі рашучае супраціўленьне, адбылася сутычка, пры якой комуністыя цяжка паранілі паліцэйскага афіцэра. Паліцэйскія выклікалі падмацаваньне, з дапамогай якога арыштавалі трох комуністых. Сярод арыштаваных—афінскі дэлегат Мотукас.

ПРОВОКАЦЫЯ ПОЛІЦЫІ ПРАВАЛІЛАСЯ

ПРАГА, 25. Провокацыя братыслаўскай поліцыі, раскрыўшай комуністычную „ваенную організацыю“ ў Славакіі, канчаткова праваліласся. Аказалася, што арыштаваныя главары „організацыі“ — поліцэйскія агэнты. Провокацыя поліцыі, накіраваная супроць комуністычнай партыі Чэха-Славакіі, выклікала абурэньне рабочых. 22 чэрвеня ў шмат якіх гарадох Чэха-Славакіі адбываліся масавыя мітынгі супроць поліцэйскай провокацыі, супроць соцыял-фашысцкай політыкі голаду, супроць фашызму і імпэрыялістычнай вайны. Пад націскам руху протэсту поліцыя вызваліла большасьць арыштаваных.

Профбюрократы сарвалі забастоўку аўтобусных шофэраў

РЫГА, 28. З прычыны здрадніцтва соцыял-бюрократычных профбюрократаў, забастоўка аўтобусных шофэраў у Рызе пацярпела няўдачу. Прадпрыемцы звольнілі 100 шофэраў, якія прымалі найбольш актыўны ўдзел у забастоўцы.

...распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“

Ячэйка ЛКСМБ профшколы будаўнікоў (Менск), пасьля пленуму Фрунзэўскага РК ЛКСМБ абгаварыла пытаньне аб правядзеньні самаправеркі і перавыбараў бюро. Сход вылучыў брыгаду і даў ёй наказ зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне соцыялістычнага дагавору па соцспаборніцтву і ўдарніцтву.

К часу перавыбараў ячэйка мае некаторыя вынікі па ўдзелу ў правядзеньні трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры. Комсамольцамі выпісана 20 экз. 12-томніку Леніна. Сыстэматычна, з 1 студзеня па 1 траўня, выпісвалася **40 экз. „Чырвонай Зьмены“.**

Ячэйка ўдзельнічала і ў гаспадарчых кампаніях. Комсамольцы на 100 проц. падпісаліся па 3 пазыку індустрыялізацыі. Распрацаваны ўсе кіруючыя матар'ялы па пытаньнях колектывізацыі на політгуртках.

Усе цэхі—сталярны, каменны, малярны, тынкавальны—хаця і раскінуты па 4-х пабудовах Менску, утварылі ўдарныя брыгады, якія наладзілі чытку газэт у абедзены адпачынак на дзьвёх пабудовах. Організавалі дзьве насьценгазэты.

На гэтым-жа сходзе абгаворана пытаньне аб месячніку „Чырвонай Зьмены“. Сход аднагалосна рашыў да 25 чэрвеня правесьці 100-проц. падпіску на «Чырв. Зьмену». Сход абвясьціў сябе ўдарным Вылучаны таварышы ў дапамогу ўпаўнаважаным, каб правесьці гэтую працу ня толькі сярод комсамольцаў і профшкольцаў, і на ўсіх чатырох пабудовах, дзе працуюць комсамольцы-профшкольцы.

На сходзе адзначана, што бюро ячэйкі **мала займалася пытаньнем праверкі становішча** ўдарніцтва на пабудовах. Ёсьць выпадкі, калі комсамольцы, **не разумеючы пытаньня адзінаначальля**, часам робяць разлад у працы. Бюро ячэйкі ў далейшым павінна паставіць пытаньне аб ударніцтве на пабудовах, бо ў гэтым напрамку яшчэ маюцца недахопы.

Профшколец.

Агульны сход ячэйкі профтэхшколы будаўнікоў (Менск), у сувязі з месячнікам „Чырвонай Зьмены“, абгаварыўшы пытаньне: ці задавальняе нас „Чырвоная Зьмена“, вынес шэраг практычных мерапрыемстваў, якія павінны быць у хуткім часе праведзены ў жыцьцё.

У асноўным газэта чытачоў задавальняе, але, разам з гэтым, сход адзначыў наступныя недахопы.

Формат газэты надзвычайна малы, яго трэба павялічыць, каб на старонках „Ч. З.“ можна было лепш і паўней высьвятляць міжнароднае становішча, соцыялістычнае будаўніцтва ў БССР і СССР і аднačасова даваць опэратыўныя зводкі выкананьня прамфінпляну па асобных фабрыках і заводах. Трэба павялічыць абмен вопытам працы паміж паасобнымі ячэйкамі, больш высьвятляць жыцьцё будаўнічага комсамолу. Часьцей выпускаць літаратурную старонку, якая ў апошні час зусім заглохла. Па магчымасьці друкаваць больш артыкулаў на абгаварэньне чытачоў, а таксама штодзённа даваць фэльетоны, якія значна ажыўляюць газэту. Неабходна аднавіць шахматна-шашачны аддзел.

Акрамя гэтага сход з свайго боку парашыў усім комсамольцам сыстэматычна да канца году выпісваць „Чырвоную Зьмену“ і абвясьціў усю ячэйку ўдарнай па збору падпіскі на газэту сярод астатніх вучняў школы. Ужо выпісана 40 экз. газэты пры наяўнасьці ў школе 60 вучняў на сёньняшні дзень.

Сход таксама парашыў выклікаць усе навучальныя ўстановы гораду Менску пасьледваць прыкладу профтэхшколы. **Гірш Каплан.**

РАБУНАК ПРЫ ЛЮДЗЯХ

(Ліст у рэдакцыю)

Як і кожны дзень, 25-УІ—30 г. я палышоў да ваконца сталоўкі за атрыманьнем талёнаў. Кінуўшы вокам на „меню“ і аблюбаваўшы сабе першае да другое — падаў касірошы рубля. Адтуль грукнула рэшта, шлёпнулі брудныя замызганыя талёны, ды пачулася: „дальше“.

Націснулі ў плечы. Наліч ная рэшта апынулася ў кішэні. Дзе тут будзеш разглядацца з рэштай, калі чым хутчэй хочацца паабедаць.

Саджуся за стол. Са мной разам селі яшчэ два хлапцы. Падыходзіць афіцыянтка. Аднačасова і аднаразова ўсе здалі талёны.

Чакаем... Зьяўляецца афіцыянтка. Хлопцам прынесла абед, а мне няма і кажа—талёнаў ня брала. Хлопцы за мяне (хоць ня ведаў хто яны — пасьля пазнаёміліся):

— І мы бачылі, як даваў талёны гэты грамадзянін.

Афіцыянтка і слухаць ня хоча, злуецца:

— Я вам ня новенькая, гэта на тых вы прывыклі пракатвацца! Знаць вас ня знаю і талёнаў вашых ня бачыл!

Я да загадчыка. Дакладваю. Выслухаў. Ідзем да афіцыянткі, а тая адно: „знаць ня знаю“. Загадчык, перагаварыўшыся з афіцыянткай, пачынае рэагаваць:

— Скажэце, колькі вы плацілі за абед?..

— Ня ведаю. Падрахуйце колькі выйдзе за боршч з катлетамі.

— Як вы ня ведаеце колькі плацілі за абед? Ды ў вас талёнаў ня было!

— А вось вам сьведкі. Людзі бачылі, як я даваў талёны.

Хлопцы ў адзін голас:

— Забрала талёны афіцыянтка.

А загадчыку гэтага мала,— колькі плацілі за абед?!

— Не памятаю ня то 40 кап., ня то 34—палічэце.

— Значыцца 34 кап. Зараз справімся.

І загадчык—маланкай да касы. Варочаецца. Масьленіца на фізіономіі гром з пярунамі на вуснах.

— Абманшчык, вымагацель, няма абедаў за 34 капейкі. Хадзем да касіршы.

— Пазнаеце гэтага грамадзяніна?

— Не пазнаю,—сумленна адказвае касірша.

Загадчык з афіцыянткай нахальным парадкам вымагаюць паказу дакумантаў, беспадстаўна пляміячы „прыгожымі“ мянушкамі: „Афэрыст, авантурнік, прахадзімец“.

Паведамляю прозьвішча і месца працы.

— **А-а-а,—студэнт?! — крычыць загадчык,—ведаем вас, ня першы трапляецца; вам-бы ўсё на шалмака!**

Рашуча адмяжоўваючыся ад усякіх там хуліганаў, авантурнікаў, спрабуючых прыкрыцца імем пролетарскага студэнта—катэгорычна, з абурэньнем протэстую супроць нахабных абвінавачваньняў загадчыка сталоўкі, высунутых супроць пролетарскага студэнцтва наогул і мяне ў прыватнасьці.

Трэба мець бляшаную каструлю замест галавы, каб так, як гэты загадчык, адмаўляць паказаньні двух таварышоў і абгрунтоўваць свой доказ майго „злачынства“ асьлінай лёгікай.

Калі ўрэшце ў нас спыніцца факты бясчынства, грубасьць і лаянка ў сталоўках? Калі будуць канчаткова выпалены гнайлівыя струпы з цела такіх важных установ, як сталоўкі?

Чытачу і пролетарскай грамадзкасьці, бязумоўна цікава ведаць пэрсонажаў і месца дзеі абеду—шаржу. Месца дзеі—сталоўка № 8. Героі: афіцыянтка Шчэрбіна і загадчык сталоўкі, які адмовіўся паведаміць сваё прозьвішча, мотывуючы тым, што загадчыка сталоўкі № 8 усе ведаюць. Ад сябе дадаю патрабаваньні: той, каму належыць і ня ведаў дагэтуль загадчыка сталоўкі № 8, павінен ў самым хуткім часе пазнаёміцца з ім. Роля злачынцы прышпілена мне.

Сябра ЛКСМБ студэнт БДУ
Т. М. Паўлоўскі.

З фотоапаратам па Менску



Старт мото-велёпрабегу Менск—Масква

НА ШЫПЦЫ ЎСЁ СПАКОЙНА...

Да ўвагі Бабруйскай АКК РСІ

У нумары 138 ад 16-УІ—„Чырвонай Зьмены“ быў зьмешчан артыкул „**Крытыкі Самакрытыкі**“, дзе прыводзіліся факты заціску самакрытыкі на шклозаводзе „**Кастрычнік**“ (Бабруйская акруга).

Для высьвятленьня фактаў была вылучана камісія партколектыву. Не гаворачы загадзя аб сутнасьці рашэньняў, якія вынесены камісіяй, мы ўсё-ж павінны адзначыць прымірэнчыя адносіны з боку паасобных работнікаў заводу і членаў камісіі да фактаў заціску самакрытыкі.

На нарадзе камісіі член КП(б)Б — нам дырэктара заводу Трацяк заявіў:

— „Якое маюць права пісаць аба мне вёпа радна ў ЦКК, калі на тое ёсьць партколектыў ці Райкомпарт.“

За некалькі дзён да гэтага Трацяк сьвядома ня даў магчымасьці „лёгкім кавалорыстым“ праверыць факты бюрократызму і цяганіны ў канторы заводакіраўніцтва.

На тым-жа пасяджэньні дырэктар заводу—партыец Пісараў—заявіў:

— „Факты заціску ёсьць. Але здымаць з працы галоўбуха Дамброўскага мы ня будзем, бо ён спэцыялісты“.

Галоўбух Дамброўскі, лічачы сябе „пакрыўджаным“ і адчуваючы, што без яго ў першыя часы будзе цяжка наладзіць працу канторы, кінуў дэмонстрацыйна працу.

Дырэкцыя заводу хадзіла прасіцца ў Дамброўскага, каб ён пайшоў працаваць.

Паасобныя сябры камісіі і кіраўнікі заводскіх організацый, пад шыльдай расьсьледваньня справы, зводзяць факты заціску самакрытыкі да пытаньня—ці рабіў галоўбух Дамброўскі падлогі ці не тады як факты з падлогамі ў даным выпадку зьяўляюцца другараднымі.

Паасобныя члены камісіі імкнуліся змазаць сутнасьць фактаў прыведзеных у артыкуле, заяўляючы: —«5 проц. праўды ёсьць і то добра».

Бязумоўна, за апошні час на заводзе ёсьць некаторыя дасягненьні ў справе разгортваньня самакрытыкі. Аднак трэба рашуча ўдарыць па тых, хто, гаворачы аб дасягненьнях, упарта не жадае бачыць значных правалаў.

Паказаныя факты, як і факты ў папярэднім артыкуле сьцьвярджаюць, што самакрытыка на заводзе неразгорнута. Аб гэтым-жа сьведчыць і рэагаваньне на прапановы вытворчых нарад.

Мы чакаем ад Бабруйскай АКК РСІ дэтальнай і шырокай праверкі становішча разгортваньня самакрытыкі на шклозаводзе „Кастрычнік“.

А. Л.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Таварышы: **Хэйман** (ф-ка „Кастрычнік“), **Грыб** („Комунар“), **Левін** (Мэдсанпрацы), **Харкоў** (Белдзяржбуд), **Бэрнштэйн** (Наркамасьветы), **Аншчук**, **Гурэвіч** („Чырвоная Зьмена“), **Бродскі** (Белдзяржбуд), **Мірынбург** (Наркамсувязь), **Шатхін** (ЦСПСБ), **Каган**, **Брыскін** (рабфак), **Каўнацкі** („Энэргія“), **Рубенчык** (АК ЛКСМБ) **Навасельскі** („Бальшавік“), **Барысевіч** (чыгунка), **Розін**, **Герчыкаў** (ЦРК) павінны зьявіцца сёньня, 30 чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары ў акругком ЛКСМБ на інструкцыйную нараду па правядзеньню агульна-гарадзкога мітынгу-масоўкі рабочай моладзі. **АК ЛКСМБ.**

Адказны рэдактар **Рэдколегія**

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599